12. Globally Important Agricultural Heritage Systems. [Электронный ресурс] // Food and Agricultural Organization of the United Nations. URL: http://www.fao.org/3/i9187en/I9187EN.pdf. (дата обращения: 10.09.2019).
13. Intergovernmental Science-Policy Platform on Biodiversity and Ecosystem Services [Электронный ресурс] // Science and Policy for People and Nature. URL: https://www.ipbes.net/ (дата обращения: 10.09.2019).
14. Rogers L. Intangible cultural heritage and international environmental law: 'the cultural dimension of environmental protection' // Historic Environment. 2017. Vol. 29, № 3. p. 30-43.

УДК 39 (476) «19/20»

# СУЧАСНЫ СТАН І ПЕРСПЕКТЫВЫ РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСКАЙ ЭТНАЛОГІІ

**Т. А. Навагродскі**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*

*пр. Незалежнасці, 4, 220030 г. Мінск, Беларусь; tadeush_minsk@mail.ru*

Прадстаўлены аналіз сучаснага стану і перспектыўных накірункаў развіцця айчыннай этналагічнай навукі. Паказана яе значэнне ў забеспячэнні прагрэсіўнага развіцця беларускага грамадства. Разглядаецца ўклад акадэмічных этнолагаў і вучоных ВНУ у вывучэнне шырокага кола актуальных праблем беларускай этналогіі.

***Ключавыя словы:*** беларуская этналогія; функцыі этналогіі; гісторыя этналагічнай навукі; праблемы этналогіі; Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры; Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт; кафедра этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў.

# СОВРЕМЕННОЕ СОСТОЯНИЕ И ПЕРСПЕКТИВЫ РАЗВИТИЯ БЕЛОРУССКОЙ ЭТНОЛОГИИ

**Т. А. Новогродский**

*Белорусский государственный университет,*
*пр.Независимости, 4, 220030, г.Минск, Беларусь; tadeush_minsk@mail.ru*

Представлен анализ современного состояния и перспективных направлений развития отечественной этнологической науки. Показана её значение в обеспечении прогрессивного развития белорусского общества. Рассматривается вклад академических этнологов и учёных ВУЗов в изучение широкого круга актуальных проблем белорусской этнологии.

***Ключавыя словы:*** беларуская этналогія; функцыі этналогіі; гісторыя этналагічнай навукі; праблемы этналогіі; Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры; Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт; кафедра этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў.

# CURRENT STATE AND PROSPECTS OF DEVELOPMENT OF BELARUSIAN ETHNOLOGY

**T. A. Navagrodski**

*Belarusian State University, Niezavisimosti Ave., 4, 220030, Minsk, Belarus;*
*tadeush_minsk@mail.ru*

The article is devoted to the current state and perspective directions of development of the national ethnological science. Its importance in ensuring the progressive development of belarusian society is shown. The contribution of academic ethnologists and university scientists to the study of a wide range of topical problems of belarusian ethnology is considered.

***Key words:*** belarusian ethnology; functions of ethnology; history of ethnological science; problems of ethnology; the Center for the belarusian culture, language and literature; Belarusian state university; the department of ethnology, museology and history of arts.

У сістэме гуманітарных навук нашай краіны важнае месца займае этналогія. Роля этналогіі як навукі ў сучасным грамадстве пастаянна ўзрастае. Гэта, перш за ўсё, звязана з тымі функцыямі, якія яна выконвае. Адна з важнейшых – навукова-пазнавальная. Этналагічная навука ажыццяўляе пазнанне этнічных рэалій, фарміруе веды аб этнічнай карціне свету ў розныя гістарычныя эпохі і ў наш час, даследуе характар і асаблівасці этнічных працэсаў ва ўсіх рэгіёнах нашай планеты. Этнолагі

імкнуцца высветліць заканамернасці паходжання, развіцця, будовы і функцыянавання этнасаў, а таксама вызначыць тэндэнцыі іх існавання ў будучым. На аснове гэтых ведаў этналогія ўдасканальвае свае тэарэтычныя ўяўленні і выкарыстоўвае іх для тлумачэння прыроды і характару этнічных працэсаў, якія адбываліся ў гісторыі і адбываюцца зараз. Абапіраючыся на сваю навукова-пазнавальную функцыю, этналогія імкнецца пераадолець этнічныя стэрэатыпы, нярэдка характэрныя для побытавай свядомасці людзей, і тым самым садзейнічаць узаемаразуменню і канструктыўнаму супрацоўніцтву паміж народамі. Важнай функцыяй таксама з'яўляецца неабходнасць самапазнання кожнага асобнага народа-этнасу. Навуковыя веды аб этнасах часта супрацьстаяць абывацельскім уяўленням і нацыянальным міфам. Функцыя сапраўды навуковага самапазнання выконваецца этнолагамі шляхам збору, назапашвання і аналізу гістарычнага вопыту жыцця народаў. Гэты вопыт мае значэнне, як абагульненне і захаванне традыцый матэрыяльнай, духоўнай і сацыяльнай культуры, але нярэдка бывае карысным пры складванні сучасных форм культуры, а таксама пры рашэнні эканамічных і тэхнічных задач. Культурныя традыцыі народнага дойлідства, харчавання, земляробства могуць быць з карысцю прыменены і ў наш час. Усе гэтыя і некаторыя іншыя функцыі этналогіі робяць яе надзвычай актуальнай і запатрабаванай. Таму выкладанне гэтай навукі ў вышэйшых навучальных установах (і не толькі гуманітарнага профілю) – адна з прыярытэтных задач, якія неабходна вырашаць у наш час.

Сёння этналогія як навука актыўна развіваецца ў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, дзе ёсць самастойны аддзел народазнаўства ў ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры». Супрацоўнікі гэтай установы распрацоўваюць актуальныя праблемы сучаснай беларускай этналогіі. Тут працуе Савет па абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый, які ўзначальвае член-карэспандэнт НАН Беларусі М. Ф. Піліпенка. Акадэмічныя этнолагі працягваюць развіваць традыцыі, закладзеныя В. К. Бандарчыкам ў 70–80-я гг. мінулага стагоддзя. Сярод прыярытэтных напрамкаў даследавання – традыцыйная культура, этнаканфесійная гісторыя, этнічныя групы і інш.

Этналогія як вучэбная дысцыпліна зараз выкладаецца на гістарычных факультэтах у ВНУ нашай краіны. Створаны кафедры, дзе гэтай навуцы надаецца шмат увагі. У Беларускім дзяржаўным універсітэце этналогія выкладалася на кафедры археалогіі, этнаграфіі і дапаможных гістарычных дысцыплін, а ў 2001 г. была створана кафедра этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў. Вядзецца падрыхтоўка гісторыкаў па спецыялізацыі «этналогія».

Студэнтам, акрамя агульных тэарэтычных курсаў «Этналогія і этнаграфія Беларусі», «Сацыяльна-культурная антрапалогія», выкладаецца шэраг спецыяльных курсаў: «Методыка палявых этнаграфічных даследаванняў», «Гісторыя этналагічных вучэнняў», «Этнічная гісторыя Беларусі», «Гістарыяграфія этналогіі Беларусі», «Антрапалогія горада», «Матэрыяльная культура беларусаў», «Традыцыйная абраднасць беларусаў», «Этнафальклярыстыка» і інш. Разнастайнасць спецкурсаў, семінараў і іншых форм навучання садзейнічае росту інтарэса студэнтаў да этналагічнай праблематыкі.

Пасля першага курса праводзіцца выязная этнаграфічная практыка, дзе на працягу трох тыдняў студэнты маюць магчымасць замацаваць веды, атрыманыя ў выніку вывучэння тэарэтычных асноў этналогіі. Па спецыяльна распрацаванаму апытальніку студэнты-этнолагі вучацца збіраць палявы этнаграфічны матэрыял, авалодваюць такімі відамі работы ў этнаграфічнай экспедыцыі, як асабістае назіранне, гутарка з мясцовымі жыхарамі, збор этнаграфічных прадметаў і інш. У рабоце такіх экспедыцый прымаюць актыўны ўдзел студэнты старэйшых курсаў спецыялізацыі «Этналогія», а таксама аспіранты кафедры. Для апошніх гэта магчымасць сабраць палявы этнаграфічны матэрыял для будучых дысертацый. Матэрыялы шэрагу экспедыцый былі часткова надрукаваны ў зборніках палявых этнаграфічных даследаванняў.

Выкладчыкі кафедры паспяхова займаюцца даследаваннем актуальных праблем беларускай этналогіі. На кафедры распрацоўваюцца праблемы этнагенеза і этнічнай

гісторыі беларусаў (М. Ф. Піліпенка) [1], традыцыйнай культуры беларусаў (Т. А. Навагродскі, І. С. Махоўская) [2; 3], этнічных груп Беларусі (С. А. Захаркевіч, У. І. Медзянік, Ю. І. Унуковіч) [4; 5; 6], гісторыі беларускай этналогіі (І. Г. Бачыла, М. А. Міхайлец, І. У. Алюніна) [7; 8; 9]. Супрацоўнікамі кафедры падрыхтавана новая тыпавая праграма, абноўлены з улікам апошніх напрацовак у этналогіі вучэбныя праграмы па агульных і спецыяльных курсах, праводзіцца выкладанне па модульна-рэйтынгавай сістэме, ажыццяўляецца кантроль за самастойнай работай студэнтаў. У якасці адной з форм кантралюемай самастойнай работы студэнтам прапануецца падрыхтоўка рэцэнзіі на адну з навуковых работ па этналогіі Беларусі. Значнай падзеяй стала выданне вучэбна-метадычнага дапаможніка з грыфам Вучэбна-метадычнага аб’яднання ВНУ Беларусі па гуманітарнай адукацыі «Этналогія Беларусі: традыцыйная культура насельніцтва ў гістарычнай перспектыве» [10]. Лепшыя выпускнікі кафедры працягваюць навучанне ў магістратуры і аспірантуры па спецыяльнасці «этнаграфія, этналогія і антрапалогія». Па праблемах этналогіі, якія распрацоўвае кафедра, за апошнія гады паспяхова абаронена адна доктарская і шэраг кандыдацкіх дысертацый. Вядзецца актыўная работа па падрыхтоўцы доктарскіх дысертацый. Пры кафедры створаны і актыўна працуе навуковы студэнцкі гурток «Гарадская этналогія» (кіраўнік С. А. Захаркевіч, а з 2018 г. – І. Г. Бачыла). Дзейнасць гуртка накіравана на фарміраванне ў студэнтаў навыкаў палявога антрапалагічнага даследавання і апрабацыю аналітычнай апрацоўкі сабранага матэрыялу на навуковых канферэнцыях. Студэнты вывучаюць працэсы ўрбанізацыі, карэнных змен у горадзе, трансфармацыю яго прасторы, традыцый. Праводзяцца сустрэчы з этнолагамі з НАН Беларусі, рэгіянальных ВНУ, а таксама пастаяннае азнаямленне студэнтаў з навінкамі навуковай літаратуры.

Акрамя БДУ, кафедра этналогіі і фальклору ёсць у Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў. Актыўна развіваецца этналогія на кафедраы гісторыі Беларусі ў Гомельскім дзяржаўным універсітэце імя Ф. Скарыны і на кафедры гісторыі і турызма ў Полацкім дзяржаўным універсітэце. Тут чытаюцца агульныя курсы па этналогіі, рыхтуюцца дыпломныя і магістарскія работы. Выкладчыкі актыўна распрацоўваюць шэраг новых актуальных праблем. Праблемы матэрыяльнай культуры даследуе былы прафесар БДПУ імя М. Танка В. С. Цітоў [11]. Ім выдадзены вучэбны дапаможнік у двух частках «Этнаграфічная спадчына», а таксама апублікавана шэраг грунтоўных прац. Гарадской этналогіяй паспяхова займаецца загадчыца кафедры гісторыі Беларусі Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя. Ф. Скарыны А. Р. Яшчанка [12]. На аснове архіўных матэрыялаў, апублікаваных этнаграфічных работ, а таксама экспедыцыйных матэрыялаў ёю даследуецца культура гарадскога насельніцтва Беларусі канца XIX – XXI ст. Народную медыцыну, уяўленні аб прасторы і часе ў традыцыйным светапоглядзе беларусаў паспяхова вывучае прафесар Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта У. А. Лобач [13], а пахавальна-памінальную абраднасць беларусаў – дацэнт гэтай жа ўстановы У. Я. Аўсейчык [14]. Ролю гарадской сям’і ў этнакультурных працэсах Беларусі вывучае прафесар ФФСН БДУ І. І. Калачова [15], а культурай сацыялізацыі беларусаў займаецца дацэнт БНТУ А. Д. Якубінская [16]. Сферай навуковых інтарэсаў дацэнта Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта І. С. Чарнякевіч з’яўляецца вясельная абраднасць насельніцтва палесскага рэгёна [17]. Рэгулярна арганізуюцца і праводзяцца студэнцкія этнаграфічныя экспедыцыі, матэрыялы якіх актыўна выкарыстоўваюцца ў вучэбна-выхаваўчым працэсе гэтых навучальных устаноў.

Этнолагі ВНУ ажыццяўляюць работу па фарміраванню ўстойлівай цікавасці ў моладзі да вывучэння гэтай важнай дысцыпліны, пастаянна працуюць над захаваннем і ўзмацненнем навуковай накіраванасці сваёй дзейнасці, над тым, каб этналогія служыла фундаментальным інтарэсам грамадства, перш за ўсё – канструктыўнаму супрацоўніцтву між народамі. Этнолагаў чакае наперадзе інтэнсіўная праца ў экспедыцыях, архівасховішчах, бібліятэках, музейных фондах і інш. Разам з тым сусветны і айчынны вопыт сведчыць, што будучая дзейнасць у гэтай галіне павінна адрозніваца ў параўнанні з мінулым якасна новымі асаблівасцямі. Патрабаванні, якія

прад’яўляюцца многімі сучаснымі даследчыкамі, заключаюцца ў тым, каб такая інфармацыя была сабрана і захоўвалася ў больш арганізаваным і сучасным выглядзе – у выглядзе банкаў дадзеных па розных аспектах этналагічнай навукі, якія мелі б аўтаматызаваныя інфармацыйна-пошукавыя сістэмы. Неабходна ажыццяўляць работу па камп’ютарызацыі шматлікай этнаграфічнай інфармацыі, шырэй яе выкарыстоўваць пры напісанні курсавых і дыпломных работ, пры падрыхтоўцы навуковых дакладаў на канферэнцыях. Палявыя этнаграфічныя матэрыялы павінны стаць больш даступнымі для выкарыстання іх студэнтамі і выкладчыкамі-этнолагамі ў розных навучальных установах краіны. Застаюцца пакуль што не дастаткова распрацаванымі многія надзвычай актуальныя праблемы этналогіі. Ажыццяўленне ўсёй гэтай вялікай і адказнай працы будзе ў значнай ступені залежаць ад узроўню кваліфікацыі і неабходнай колькасці кадраў прафесійных этнолагаў, ад тых, каму прыйдзецца працаваць у будучым. Усё гэта вымагае ад этнолагаў, якія сёння выкладаюць у вышэйшых навучальных установах краіны, напружанай працы, адказнасці і разумення важнасці сваёй дзейнасці для далейшага развіцця этналагічнай навукі.

**Бібліяграфічныя спасылкі:**


1. Пилипенко М. Ф. Возникновение Белоруссии: Новая концепция. Минск: Беларусь, 1991.
2. Навагродскі Т. А. Эвалюцыя традыцый харчавання беларусаў у XIX–XX стагоддзях. Мінск: БДУ, 2015.
3. Маховская И. С. Белорусская традиционная родинная обрядность в восточноевропейском контексте (кон. XIX – нач. XX в.): автореф. дис. на соиск. учен. степ. канд. ист. наук: 07.00.07. Мінск, 1999.
4. Захаркевич С. А. Стратегии адаптации этнических меньшинств Беларуси // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі. 2007. Вып. 3: у 2 ч.: Ч. 2. С. 154–165.
5. Медяник В. И. ОБСЕ и европейская система защиты прав этнокультурных групп // Этнокультурное развитие Беларуси в XIX – начале XXI в.: материалы междунар. науч.-практ. конф. 2011. С. 201–207.
6. Внуковіч Ю. І. Літоўцы Беларусі: этналагічнае даследванне. Мінск: Беларус. навука, 2010.
7. Бачыла І. Г. Вывучэнне беларускіх трапез айчыннымі навукоўцамі ў другой палове XX – пачатку XXI стст. // Весн. БДУ. Сер. 3, Гісторыя. Эканоміка. Права. 2014. № 1. С. 18–21.
8. Міхайлец М. А. Польская этналогія XIX – першай паловы XX стагоддзя аб матэрыяльнай культуры беларусаў. Мінск: Беларус. навука, 2008.
9. Олюнина И. В. Социальная культура Белорусского Полесья в работах К. Мошиньского 1920–30-х гг. // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі. 2011. Вып. 11. С. 441–447.
10. Этналогія Беларусі: традыцыйная культура насельніцтва ў гістарычнай перспектыве: вучэб.-метад. дапам. Мінск: БДУ, 2009.
11. Цітоў В. С. Народная спадчына: матэрыяльная культура ў лакальна-тыпалагічнай разнастайнасці. Мінск: Навука і тэхніка, 1994.
12. Яшчанка А. Р. Гомель у другой палове XIX – пачатку XX ст.: Гісторыка-этнаграфічны нарыс. Гомель: ГГТУ імя Сухога, 1997.
13. Лобач У. А. Міф. Прастора. Чалавек: беларускі традыцыйны ландшафт у семіятычнай перспектыве. Мінск: Тэхналогія, 2013.
14. Аўсейчык У. Я. Пахавальна-памінальная абраднасць беларусаў Падзвіння: гістарыяграфія і сучасны стан даследаванняў // Веснік Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта. Серыя А. Гуманітарныя навукі. 2009. №7. С. 61–70.
15. Калачова І. І. Этнакультурныя працэсы ў гарадской сям'і беларусаў у апошняй трэці XX – пачатку XXI ст. Мінск: Беларус. навука, 2009.
16. Якубінская А. Дз. Традыцыйная сацыялізацыя дзяцей беларускіх сялян у другой палове XIX – першай палове XX ст. Мінск: РІВШ, 2010.
17. Чарнякевіч І. С. Гісторыка-этнаграфічнае раянаванне вясельнай абраднасці беларускага Палесся: аўтарэф. дыс. …канд. гіст. навук: 07.00.07. Мінск, 2006.